У свеце прыгожага

# «Палітра вясны. Пакуль расце трава на Беларусі»









**Пад такой назвай у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працавала выстава акварэлі беларускіх мастакоў. Гэтай традыцыі — на пачатку вясны ладзіць вясновы вернісаж — ужо шмат гадоў, выстава нязменна карыстаецца поспехам у наведвальнікаў.**

Арганізатарамі выставы выступілі Нацыянальная бібліятэка Беларусі, арт-студыя «АКВАВІР» (кіраўнік Уладзімір Рынкевіч), Беларускі саюз мастакоў.

У выставе прынялі ўдзел больш за 30 аўтараў, сярод іх — Вячаслаў Паўлавец, Уладзімір Рынкевіч, Сяргей Пісарэнка, Алесь Квяткоўскі, Мікалай Каўзановіч, Фелікс Гумен, Мікалай Аўчыннікаў, Ала Кушнер, Вольга Навіцкая, Вольга Кароль-Закрэўская, Ягор Арцюхоў, Галіна Хайдарава, Святлана Курашова, Таццяна Лешчанка, Святлана Тупахіна, Віялета Новік і іншыя. Кожны з іх мае свой, адметны почырк, сваё бачанне, свой жыццёвы вопыт. І гэта разнастайнасць вельмі цешыць.

Вясна — бадай, самая доўгачаканая пара года, таму што яна прыходзіць на змену халоднай зіме з яе доўгімі цёмнымі начамі, сцюдзёным ветрам, рэдкім сонцам, шэрымі самотнымі дрэвамі…

Менавіта вясной абуджаецца прырода. На схілах узгоркаў, якія першыя пазбаўляюцца ад снежнага покрыва, распускае свае пялёсткі насустрач сонцу далікатная сон-трава, блакітным кілімам рассцілаюцца пралескі, буяе у лесе беласнежны кураслеп. А палеткі становяцца смарагдавымі. Іх выгляд так лашчыць вока… У прыродзе пачынаецца новы цыкл.

Абуджаюцца ад так званай зімняй спячкі і людзі. Паляпшаецца настрой, з'яўляюцца новыя ідэі, вясна натхняе на здзяйсненне даўно задуманага. Вясной мы прагнем абнаўлення, становімся рамантыкамі… Гледзячы на працэсы, якія адбываюцца ў прыродзе, верым у свае сілы, верым, што і мы зможам нешта змяніць у сваім жыцці, выйсці на новы ўзровень. Калі маленькі парастак здольны прабіцца праз таўшчыню зямлі да сонца, на волю, да сваёй мэты, то і мы здольны на гэта. Змяніць звыклы лад жыцця, здзейсніць падарожжа, асвоіць новую прафесію… Здзейсніць сваю мару!

**Святлана Пятрова, фота аўтара**